

# АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА, НАЦБАНК, МЯСЦОВАЯ ВЕРТЫКАЛЬ, ДЫПЛАМАТЫ...

**Кадравы дзень у Палацы Незалежнасці ўчора быў насычаны**

(Падрабязнасці на 2–4 стар.)


РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 САКАВІКА 2025 г. ПЯТНІЦА № 61 (30449)


ВАНДРОЎКА ПАТРЫЁТА

## ПАЗНАЙ БЕЛАРУСЬ!

### Дзе добра адпачыць у нашай краіне

Правы на адпачынак нам гарантуе Канстытуцыя. Умець праводзіць вольны час цікава і з карысцю — свайго роду талент. А магчымасцяў для гэтага сёння мноства, нават калі гаворка ідзе не пра свабодныя тыдні, а ўсяго толькі пра выхадныя дні. Адказ на пытанне «Куды беларусу паехаць у Беларусі?» шукаем на выстаўцы «Адпачынак-2025».

СТАР. 6–7





Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



**+TV ПРАГРАМА**

«БЕЛЫЯ РОСЫ»



КУДЫ РУХАЕЦЦА ПРЫДАРОЖНЫ СЭРВІС? 6–7



ПРАВЕРЦЕ СВАЮ ЎДАЧУ СА «ЗВЯЗДОЙ»! 16

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

СПАЖЫВЕЦ

## ПАРАСТКІ Ў ЦАНЕ

### На рынках ужо прадаюць расаду



У нашы дні, калі на Новы год горача ў дэмісезонным паліто, а ў сярэдзіне сакавіка даводзіцца даставаць ужо далёка схаваныя шапку і рукавіцы, «наводзіць гадзіннік» па старых народных прыкметах, на жаль, не атрымліваецца. Прыкмета нашага часу: калі на рынках з'явілася расада, значыць, халады дакладна мінулі і наперадзе нас чакае сонейка і цяпло.

СТАР. 8–9

ISSN 1990 — 763X

25061

# «ТРЭБА ДАВАЦЬ ВЫНІК КОЖНЫ ДЗЕНЬ»

## Падрабязнасці кадравага дня ў Прэзідэнта

У Палацы Незалежнасці — кадравы дзень. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў новых кіраўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання, дыпламатычных місій і мясцовых органаў улады. Сваю работу на новых пасадах яны пачнуць з тых асноўных задач і патрабаванняў, якія па традыцыі агучыў кіраўнік дзяржавы. Глабальна нічога новага і невядомага не прагучала, Аляксандр Лукашэнка чарговы раз актуалізаваў тыя пытанні, на якія варта звярнуць самую пільную ўвагу, і нагадаў, што кожны на сваім месцы павінен працаваць адказна і сумленна.



### «УЛАДЫ БОЛЬШ, І АДКАЗНАСЦЬ БОЛЬШАЯ»

Дзмітрый Матусевіч прызначаны намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, да гэтага ён узначальваў Дзяржаўны камітэт па маёмасці. «Тут работа не цяжэйшая, чым цяперашняя твая. Але гарачая патэльня, як я гавару. Усё няпроста. Не цяжэйшая работа, але ўлады больш і адказнасць большая», — папярэдзіў Прэзідэнт Дзмітрыя Матусевіча.

Расказваючы журналістам аб задачах, якія прыйдзецца вырашаць на новай пасадзе, Дзмітрый Матусевіч на першае месца паставіў выкананне перадвыбарнай праграмы Прэзідэнта. Таксама ўвага будзе засяроджана на канцэпцыі новай пяцігодкі. Ён расказаў, што даручана прынцыпова разглядаць усе дакументы, якія будуць уносіцца Прэзідэнту. Яшчэ адзін важны аспект — кадры. Новаму намесніку кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта даручана ўнесці прапановы па кандыдатуры новага кіраўніка Дзяржкамітэта па маёмасці. «Для мяне задачы ў цэлым зразумелыя. Будзем рэалізоўваць даручэнні, адстойваць прынцыповую пазіцыю эканамічнага блока», — адзначыў Дзмітрый Матусевіч.

### «ТРЭБА, КАБ БАНКАЎСКАЯ СІСТЭМА БЫЛА КІРАВАНАЙ»

Аляксандр Ягораў з пасады намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта прызначаны на пасаду першага намесніка Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка. Звяртаючыся да Аляксандра Ягорава, Прэзідэнт звярнуў увагу на адзіны аспект, які яго насцярожвае: «Каб галава не закруцілася ад такой кар'еры». Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што на новай пасадзе Аляксандра Ягорава трэба загрузіць напоўніцу, і нават неўласцівымі для Нацыянальнага банка пытаннямі. Як чалавека, які прайшоў няхай хутка, але прыстойныя ўзроўні. «На ім шмат персанальных праектаў, якія ён павінен давесці да канца, нягледзячы на пасаду», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой. На што беларускі лідар параіў падкінуць яму яшчэ пару праектаў. Аляксандр Ягораў на гэта заўважыў, што будзе толькі рады.

Прэзідэнт папярэдзіў, што плануе сустрэцца з калектывам Нацбанка, начальнікамі асноўных упраўленняў, як толькі новае кіраўніцтва будзе гатова да гэтага. «Каб яны разумелі, што гэта не вы там прыйшлі і пачынаеце варушыць цэнтральны банк. Натуральна, давядзецца варушыць трошкі іх», — патлумачыў ён. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў цяжкія часы ў Нацбанку не схібілі: «Як бы там ні было, хто што думае — не думае, але яны шмат зрабілі для краіны. Таму я і кажу: вам і Калаура (экс-старшыню праўлення Нацбанка. — **«Зв.»**) не трэба страціць. Трэба, каб ён заўжды пад рукой быў. Прымеце вы яго парады або не, але ён свой пункт гледжання выкажа. Ён добры банкір. Час жа надыходзіць — усё роўна трэба, каб новае пакаленне — я ж гаварыў аб гэтым — прыходзіла да кіравання краінай», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Галоўнай задачай для кіраўніцтва Нацбанка Аляксандр Лукашэнка назваў парадак у банкаўскай сістэме.

**І Прэзідэнт звярнуў увагу, што кіраўніцтва Нацбанка павінна мець сур'ёзны ўплыў на камерцыйныя банкі, якія, па яго словах, павінны працаваць дакладна, у адпаведнасці з заканадаўствам. «Не павінна быць так, што ніхто нікому не падпарадкаваны, што ніхто ні перад кім не нясе ніякіх абавязацельстваў. Трэба, каб сістэма была кіраванай».**

«Некаторыя тут пачалі вякаць: ну, прыйшлі тут Галоўчанка з Ягоравым — яны тут зараз станок уключаць. Ды ў іх няма станка. Станок у мяне стаіць за кабінетам, ён ужо заржавеў», — з гумарам заўважыў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што Беларусь не тая краіна, каб сёння ўключыць станок і пачаць друкаваць грошы, гэта заўтра момантам выльецца ў інфляцыю. «І ніхто не збіраецца ўключаць ніякія станкі, бо ў нас сітуацыя не тая, каб уключаць. У краіне сітуацыя больш-менш нармальная», — заўважыў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ёсць залежнасць ад сітуацыі на рынках. Але ўсё ж у краіне навучыліся трымаць баланс. «Таму, ну, зразумела, хочуць узрушыць насельніцтва, што вось заўтра пойдзе інфляцыя, мы тут пачнём абясцэньваць нашу нацыянальную валюту і гэтак далей... Мы самагубствам займацца не збіраемся», — канстатаваў Прэзідэнт.

У размове з журналістамі Аляксандр Ягораў падкрэсліў, што ўсе банкі, у тым ліку і камерцыйныя, павінны працаваць разам з агульнай мэтай — дзеля якаснага эканамічнага росту. «Банкаўская сістэма павінна быць нацэлена на асноўныя задачы. Першая — інвестыцыйнае крэдытаванне, крэдытаванне праектаў, якія дадуць высокую дабаўленую вартасць. Другая задача — падтрымка тавараў, падтрымка экспарту, абаротнае крэдытаванне, якое будзе дазваляць пашыраць вытворчасць і садзейнічаць нашаму эканамічнаму росту. І трэці кірунак — спажывецкае крэдытаванне, якое найперш павінна ісці на пакупку беларускіх тавараў і стымуляванне ўнутранага попыту», — адзначыў Аляксандр Ягораў. Ён таксама падкрэсліў, што першачарговую задачу па стрымліванні інфляцыі для Нацыянальнага банка ніхто не здымаў. «Нізкі ўзровень цэн з'яўляецца адным з ключавых крытэрыяў росту дабрабыту насельніцтва. Мы не можам дапусціць скатвання ў нейкую інфляцыйную спіраль. Таму ўсе дзеянні Нацыянальнага банка будуць накіраваныя на падтрымку цэнавай і фінансавай стабільнасці», — расказаў Аляксандр Ягораў.

### НЕ КАНКУРЫРАВАЦЬ, А ДАМАЎЛЯЦЦА

Генеральны дырэктар ААТ «Гродзенскі шклозавод» Дзяніс Юрчанка ўзначаліў РУП «Кіруючая кампанія холдынга «Беларуская шкляная кампанія». Холдынг «Беларуская шкляная кампанія» ўтвораны ў 2020 годзе і ўключае ў сябе ўсе дзяржаўныя прадпрыемствы галіны: «Гомельшкло», шклозавод «Нёман», «Белдмедшкло» і Гродзенскі шклозавод. Па словах Дзяніса Юрчанкі, вынік работы Беларускай шкляной кампаніі паказвае, што рашэнне аб аб'яднанні галіновых прадпрыемстваў было правільным як для вырашэння асноўных праблем, так і для далейшага развіцця шкляной галіны ў Рэспубліцы Беларусь.

У склад холдынга ўваходзяць дзяржаўныя прадпрыемствы. Два прыватныя заводы працуюць самастойна. «То-бок вы не ў інтарэсах гэтых прыватных прадпрыемстваў працуеце?» — удакладніў Прэзідэнт. «Мы не сапернічаем, мы ў нейкай ступені ўзаемадзейнічаем. У нас няма перашкод, няма рознагалоссяў, але яны пакуль трымаюцца адасоблена, як прыватныя прадпрыемствы», — растлумачыў Дзяніс Юрчанка. Ён адзначыў, што прыватныя прадпрыемствы патэнцыяльна могуць увайсці ў склад холдынга, ва ўсякім выпадку, ім ніхто не будзе перашкаджаць гэта зрабіць. Кіраўнік дзяржавы параіў сілай нікога ў холдынг не заганяць, але і прыватнікаў не адштурхоўваць. «Рэсурсы, сыравіна і іншае ў вас практычна з адной крыніцы, можна сказаць. Таму чаго канкурыраваць там, дзе трэба дамаўляцца? І гэта не ва ўрон і не на шкоду дзяржаве», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён пацікавіўся, як наладжаны экспарт айчыннай шкляной прадукцыі. «З кастрычніка для нас закрыўся еўрапейскі рынак. Але мы змаглі пераарыентавацца на найбліжэйшы да нас расійскі рынак і працягваем яго развіваць. Пакуль сітуацыя складваецца нядрэнна», — расказаў Дзяніс Юрчанка.

## ТРЭБА РАЗВІВАЦЬ МАГІЛЁЎ

Дырэктар Магілёўскага завода ліфтавага машынабудавання Сяргей Чарткоў узначаліў Магілёўскі гарвыканкам. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што пасада кіраўніка горада — зусім не чыноўніцкая, але вельмі цікавая. Сяргей Чарткоў запэўніў, што завод, які ён узначальваў да гэтага, у першым квартале выканае ўсе паказчыкі па бізнес-плане. «Год будзе няпросты. Але перспектыва выдатная, таму што ў той жа Расійскай Федэрацыі да 2030 года трэба замяніць 120 тысяч ліфтаў. Плюс новыя будынкі. Плюс Азербайджан, Манголія, Грузія, Узбекістан — ёсць дзе працаваць. Таму я думаю, што з прадпрыемствам будзе ўсё добра», — адзначыў Сяргей Чарткоў. Ён падкрэсліў, што і Магілёў дынамічна развіваецца ў апошнія гады, але і спыняцца нельга.

**«Я хачу, каб ты працаваў сумленна і па-сапраўднаму. Гэта твой горад. Упэўнены, ты любіш яго. Трэба развіваць Магілёў», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што гэта перспектыўны горад, для якога ў апошнія гады шмат зроблена. Але, па словах Прэзідэнта, усё ж такі Магілёў крыху адстае ад іншых абласных гарадоў. Таму задача для новага кіраўніцтва — даводзіць горад да розуму.**

Тым больш, як звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, разыначка ёсць заўсёды. Ён прывёў у прыклад абноўлены парк Падніколле, які стаў любімым месцам адпачынку для гараджан. Па словах Прэзідэнта, трэба развіваць і іншыя раёны горада, прыводзіць у парадак берагі Дняпра, каб людзям там было камфортна. «Мы будзем садзейнічаць гэтаму», — запэўніў беларускі лідар. Па яго словах, Магілёў павінен стаць такім жа прыгожым, як Гомель ці Гродна. «Я вельмі люблю абласныя гарады. Але Магілёў трэба падцягваць, — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка. — Ёсць месцы, за якія можна добра зачапіцца (і ўжо зачапіліся) і ў далейшым развіваць Магілёў». Новы кіраўнік Магілёва сказаў, што да выканання ўсіх задач гатовы.

## «У ВОБЛАСЦІ БУДЗЕ СКЛАДАНЕЙ»

Ксенія Панцюхова, якая ўзначальвала Гомельскае аддзяленне Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, цяпер намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама, адказны за эканоміку і прамысловасць. Звяртаючыся да яе, Прэзідэнт заўважыў, што ў вобласці будзе складаней. «Я заўсёды асцерагаюся на вялікія пасады прызначаць жанчын у тым плане, што гэта ж шалёная нагрузка, — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што ў гэтай пяцігодцы нагрузка будзе яшчэ большай. — Я рады, што жанчыны ў кіраўніцтве, але заўсёды са спагадай стаўлюся да вас, таму што гэта няпростая праца». Ксенія Панцюхова запэўніла, што жанчыны цяпер моцныя і яна справіцца.

Журналістам Ксенія Панцюхова прызналася, што вялікай адказнасці, якую прадугледжвае новая пасада, яна не баіцца, настроена бадзёра і аптымістычна. «Год будзе даволі няпросты, мы заканчваем пяцігодку. Гомельская вобласць змяшчае 20 % прамысловай вытворчасці ўсёй рэспублікі. І ў яе вялікі патэнцыял. У нас ёсць рэзервы, у нас ёсць куды расці», — адзначыла яна. Разам з тым, і на гэта нярэдка звяртае ўвагу Прэзідэнт, Гомельская прамысловая вобласць не ў перадавіках. Журналісты пацікавіліся ў Ксеніі Панцюховай яе бачаннем, чаго не хапае. «На сёння самае галоўнае — дыверсіфікацыя экспарту. Калі Расія для нас традыцыйны рынак, то сёння трэба ўжо глядзець на рынкі Азіі і Афрыкі. Гэта тыя рынкі, якія цікавыя нам і якім цікавыя мы», — адказала намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама.

## «У ВАС НЯМА МАГЧЫМАСЦІ КУДЫСЬЦІ АДСТУПАЦЬ»

Асобная ўвага — мясцовым органам улады. Генеральны дырэктар РУП «Купалаўскае» — кіруючая кампанія холдынга» Міхаіл Крыцкі прызначаны старшынёй Бабруйскага райвыканкама. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой адзначыў, што Бабруйскі раён трэба сур'ёзна падцягваць, бо ён цяпер сутыкнуўся з праблемай адтоку насельніцтва. «Яшчэ адзін з аргументаў у прызначэнні Міхаіла Леанідавіча — там плануецца рэалізаваць шэраг сур'ёзных інвестыцыйных праектаў па праграме ўльтрасучаснай свінагадоўлі. Можа быць пабудаваны вялікі свінакомплекс, і яго досвед у сельскай гаспадарцы тут адыгрывае вялікую ролю», — дадаў Дзмітрый Крутой.

«У вас няма магчымасці кудысьці адступаць, нават на паўкрок. Трэба даваць вынік кожны дзень. Вы бачыце, якія надзеі на вас», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы новага кіраўніка Бабруйскага райвыканкама. Ён адзначыў, што належная дапамога і падтрымка будзе аказана, але і кантроль адпаведны. Дзмітрый Крутой заўважыў, што Міхаіл Крыцкі ведае няпростую спецыфіку сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Бабруйскага раёна. Па яго словах, раёну патрэбныя зусім іншыя інвестыцыйныя праекты, не тыя, якія цяпер уключаны ў праграму «Адзін раён — адзін праект». Перад новым кіраўніком Бабруйшчыны стаіць задача перагледзець усю палітыку і стратэгію раёна. Прэзідэнт даручыў Дзмітрыю Крутому як упаўнаважанаму па Магілёўскай вобласці ўсяляк у гэтым дапамагаць. «Але майце на ўвазе, што гэта вельмі сур'ёзны раён і сур'ёзнае прызначэнне», — папярэдзіў ён.



Нямала праблем у Круглянскім раёне, на што звяртаў увагу і кіраўнік дзяржавы. «Круглае страціла дынаміку», — адзначыў Дзмітрый Крутой. Таксама ў раёне не выканалі шэраг даручэнняў Прэзідэнта, арганізацыі, якія ў свой час грымелі на ўсю краіну, не выканалі свае задачы. «Людзі гэта адчуваюць, зарплата ніжэйшая, чым сярэдняя па вобласці, на 15 і больш працэнтаў. Нейкіх сур'ёзных пунктаў росту папярэдні старшыня не знайшоў», — праінфармаваў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Таму Круглянскаму раёну патрэбны новы погляд. Адказнасць за гэта ўсклалі на Івана Багеля, які да гэтага працаваў першым намеснікам старшыні Дрыбінскага райвыканкама — начальнікам упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якая сітуацыя ў Дрыбінскім раёне. Прэзідэнт нагадаў, што ў свой час і пры яго ўдзеле было нямала зроблена, каб з Дрыбіна зрабіць раённы цэнтр: Аляксандр Лукашэнка расказаў, што сёлета плануе наведаць Дрыбінскі і Горацкі раёны і асабіста азнаёміцца з сітуацыяй на месцы. Таксама Прэзідэнт расказаў, што наведае і іншыя рэгіёны, у прыватнасці Гомель і Віцебск, праверыць выкананне сваіх даручэнняў.

Першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна Магілёва Аляксей Шарай перайшоў на пасаду старшыні Крычаўскага райвыканкама. Сяргей Янковіч, дырэктар філіяла «Аўтобусны парк № 6 ААТ «Гомельаблаўтатранс», стаў кіраўніком адміністрацыі Навабеліцкага раёна Гомеля. Першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска Сяргей Рубанаў — новы кіраўнік гэтага сталічнага раёна. Арцём Шагідзевіч, рэктар Беларускай акадэміі авіяцыі, — новы кіраўнік Фрунзенскага раёна Мінска. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў Беларусі заўсёды ганарыліся падрыхтоўкай пілотаў, асабліва ў грамадзянскай авіяцыі. Таму ён паставіў задачу аператыўна знайсці замену на пасаду рэктара Беларускай акадэміі авіяцыі. Кандыдатура Дзмітрыя Сямёнава, намесніка начальніка ўпраўлення культуры Мінскага гарвыканкама, узгоднена на пасаду генеральнага дырэктара Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм».

«Гэта пяцігодка будзе няпростай. Я хачу, каб гэту пяцігодку вы адпрацавалі», — звярнуўся Прэзідэнт да зноўпрызначаных. Ён звярнуў увагу, што сёння адчынены дзверы не толькі на традыцыйныя рынкі Расіі і Кітая, але і на рынкі Інданэзіі, Паўночнай Карэі, М'янмы, Афрыканскага кантынента.

**«У Амане мы нядаўна былі — драўніны ў іх няма, прадукты харчавання ім патрэбны. А ў нас што, гэтага няма? Я нават ім прапанаваў: вазьміце Віцебскую вобласць — яны будуць вырабляць для вас і прадукты харчавання, і дрэваапрацоўку арганізуйце. Нядаўна былі іх прадстаўнікі. Таму проста трэба кожнаму варушыцца. Чаму я і прапанаваў у кожным раёне стварыць хаця б па адным прадпрыемстве», — прывёў прыклад Прэзідэнт.**

Ён таксама нагадаў пра свае даручэнні аднаўляць ПМК, «Сельгастэхніку» і іншыя прадпрыемствы, патрэбныя для многіх раёнаў.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што старшыні райвыканкамаў павінны лепей за ўсіх адчуваць і ведаць, што неабходна іх раёнам. «І трэба, каб не толькі ў людзей былі працоўныя месцы, а каб вы былі гаспадарамі. Паўнамоцтвы мы вам не проста на паперы далі. Вы чуеце мае развагі і трэнд у гэтым кірунку. Мы рухаемся да таго, каб у вас было больш правоў і паўнамоцтваў. Але для таго, каб іх рэалізоўваць і ажыццяўляць, у вас павінна быць не толькі жыллёва-гаспадарчая кантора — у вас павінны быць адпаведныя прамысловыя і іншыя прадпрыемствы», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, не трэба забываць і аб прадпрыемствах рэспубліканскага ўзроўню. «Не думайце, што яно чужое. Вашы людзі там працуюць, вы за іх адказваеце. Таму вы патрабуйце. Каб парадак, чысціня былі, зарплата, збыт прадукцыі. Не забывайце, што гэта ваша зона адказнасці. Не чакайце ў гэтым плане ніякіх указанняў», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

## ДАЛЕЙШАЕ РАЗВІЦЦЁ БУДЗЕ

Ратацыі адбыліся ў дыпламатычным корпусе. Намеснік міністра замежных спраў Юрый Амбразевіч прызначаны паслом Рэспублікі Беларусь пры Святым Прастоле. Аляксандр Лукашэнка спытаў, ці сапраўды ён сам хоча паехаць паслом або з міністэрства яго «выціскаюць». «У мяне прэтэнзій няма да тваёй работы», — сказаў ён. Юрый Амбразевіч падкрэсліў, што паслом ён едзе добраахвотна: «Я зыходжу з таго, што гэта класіка нашай работы, дыпламатычнай службы. Разлічваю, што ўсё складзецца на гэтым новым месцы і будзе далейшае развіццё».

«Ты гэта абсалютна правільна разумееш. Далейшае развіццё будзе. Ты яшчэ зусім малады чалавек і добры дыпламат», — пацвердзіў Аляксандр Лукашэнка.

«Знешняя палітыка Беларусі выключна міралюбівая, і важная мэта — набыццё сяброў, і праз іх магчымасці — адстойванне нацыянальных інтарэсаў, у тым ліку ў сферы знешняга гандлю і прыцягнення знешніх інвестыцый. У гэтым кантэксце Ватыкан і асабіста Папа Рымскі маюць у свеце вялікі аўтарытэт і валодаюць значным уплывам на грамадства і эліты дзяржаў, дзе каталіцкая рэлігія мае традыцыйна сур'ёзны ўплыў на менталітэт, на светапогляд людзей, на чалавечыя каштоўнасці. Гэтыя каштоўнасці традыцыйна сугучныя каштоўнасцям беларускага грамадства», — адзначыў Юрый Амбразевіч у размове з журналістамі. Па яго словах, стварэнне беларускага пасольства ў Ватыкане дасць магчымасць умацаваць нашы пазіцыі ў дзяржавах Лацінскай Амерыкі, Афрыкі, а таксама дазволіць умацаваць нашы пазіцыі адносна работы з грамадскімі элітамі, дзяржаўнымі элітамі еўрапейскіх дзяржаў і дзяржаў Паўночнай Амерыкі. Юрый Амбразевіч адзначыў, што падыходы Беларусі і Ватыкана супадаюць па шматлікіх пытаннях. Дзякуючы гэтаму, наша супрацоўніцтва плённа развіваецца не адзін год.

Месца Юрыя Амбразевіча ў МЗС вакантным не будзе. Кандыдатура Ігара Сякрэты, начальніка ўпраўлення знешняй палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта, узгоднена на пасаду намесніка міністра замежных спраў. Яго пасаду ў Адміністрацыі Прэзідэнта зойме Дзмітрый Міронч ык, які ўзначальваў галоўнае ўпраўленне Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі МЗС.

Дырэктар свабоднай эканамічнай зоны «Мінск» Анатоль Бубен прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом у Малдове. Кіраўнік дзяржавы таксама спытаў аб планах папярэдняга пасла ў гэтай краіне Анатоля Калініна.

Працяг на 4-й стар. ►

# «ТРЭБА ДАВАЦЬ ВЫНІК КОЖНЫ ДЗЕНЬ»

«Мы з ім сустракаліся ў час яго водпуску тут, у Мінску. Ён папрасіўся на іншую работу. Калі магчыма, у краіне яму нешта знайсці з улікам яго вялікага вопыту работы і віцэ-прэм'ерам, ведання будаўнічага, жыллёва-камунальнага комплексу», — адказаў Дзмітрый Крутой. «Трэба паглядзець. На пенсію мы нікога адпраўляць не збіраемся. А калі працаваць чалавек хоча, дык работы ў нас хапае. Таму трэба прапанаваць нешта», — пагадзіўся Прэзідэнт.

## РЭЦЭПТ ДАСТАТКОВА ПРОСТЫ

Андрэй Андрэеў, які з 2020 года быў Генеральным консулам Беларусі ў Шанхаі, цяпер пасол Беларусі ў Бразіліі і па сумяшчальніцтве ў Рэспубліцы Парагвай і ва Усходняй Рэспубліцы Уругвай. Размаўляючы з журналістамі, ён адзначыў, што ў Беларусі і Бразіліі створана добрая база для ўзаемнага гандлю і супрацоўніцтва ў гэтым напрамку неабходна паглыбляць. Па словах пасла, перспектыўным бачыцца супрацоўніцтва ў сельскай гаспадарцы, сферы машынабудавання, медыцыны. «Будзем працаваць над пашырэннем таварных пазіцый. У прыватнасці, ужо адпрацоўваецца пытанне пастаўкі льняных тканін на бразільскі рынак. Рэцэпт дастаткова просты: трэба браць і рабіць тыя рэчы, якія ўзаемавыгадныя і цікавыя для абедзвюх краін», — падкрэсліў Андрэй Андрэеў. Што тычыцца палітычнага ўзаемадзеяння, то, па яго словах, работа праводзіцца ў двухбаковым і шматбаковым фармаце, напрыклад на пляцоўцы БРІКС. Дыпламат падкрэсліў, што пазіцыя Бразіліі супадае з поглядамі Беларусі на справядлівае светаўладкаванне, на сусветную палітычную сітуацыю. І гэта дапаможа ў развіцці адносін. «Часта краіны далёкай дугі становяцца нашымі вельмі блізкімі і надзейнымі партнёрамі. Мы знаходзімся далёка ад Бразіліі, але Бразілія нас добра ведае, мы таксама ведаем Бразілію. Наша задача — зрабіць Бразілію яшчэ бліжэйшай і больш зразумелай для беларусаў і зрабіць беларусаў яшчэ бліжэйшымі і больш зразумелымі для жыхароў Бразіліі», — заўважыў пасол. Па яго словах, трэба наладзіць дыялог па лініі парламентаў, жаночых і маладзёжных арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў.

Ігар Белы, які прадстаўляў інтарэсы Беларусі ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы і па сумяшчальніцтве ў Батсване, Мазамбіку і Намібіі, прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах і па сумяшчальніцтве ў дзяржаве Кувейт. У размове з журналістамі ён падкрэсліў, што палітычнае супрацоўніцтва Беларусі і ААЭ наладжана на высокім узроўні, усталяваны добрыя кантакты паміж кіраўнікамі дзяржаў. «Аб'яднаныя Арабскія Эміраты — вельмі важны эканамічны партнёр Беларусі. Таму кіраўнік дзяржавы дакладна падкрэсліў, што мая асноўная задача — развіваць эканамічныя адносіны. Наш экспарт вельмі дыверсіфікаваны, і я буду ставіць перад сабой задачу павялічыць аб'ёмы нашых паставак. Але ААЭ — гэта краіна з вельмі добрымі магчымасцямі. Таму я буду працаваць і з лагістыкай, і з фінансамі, і з іншымі перспектыўнымі сферамі. Значная ўвага будзе ўдзелена інвестыцыйным праектам», — падзяліўся планамі Ігар Белы. Новы і вельмі перспектыўны кірунак супрацоўніцтва — штучны інтэлект. Дыпламат звярнуў увагу, што Эміраты заявілі аб сваім намеры да 2030 года стаць нумарам адзін у свеце па развіцці штучнага інтэлекту: «Я лічу, што для нас гэта вельмі добрыя магчымасці. І я буду ўдзяляць гэтаму кірунку шмат увагі. Думаю, што праблем не будзе. Наш Савет Рэспублікі ўжо размаўляе са сваімі калегамі аб абмене досведам у развіцці заканадаўства ў сферы штучнага інтэлекту. Гэта вельмі складаная рэч. А ў ААЭ гэта сфера ўжо рэгулюецца, і нам цікавы іх досвед», — распавёў Ігар Белы.

Анатоль Глаз, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Турцыі, цяпер па сумяшчальніцтве будзе прадстаўляць інтарэсы нашай краіны і ў Іраку. Саветнік аддзялення Пасольства Беларусі ва Уладзівастоку Ігар Сокал узгоднены на пасаду Генеральнага консула ў гэтым расійскім горадзе. Старшы саветнік Генеральнага консульства Беларусі ў Екацярынбургу Сяргей Чычук цяпер узначаліў Генеральнае консульства. Першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Алег Швец — Генеральны консул Беларусі ў Ніжнім Ноўгарадзе.

Таксама сярод кадравых рашэнняў Прэзідэнта — прызначэнне прарэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту Мікалая Казакова рэктарам гэтай ВНУ. Кандыдатура Аляксея Васючэнкі, кіраўніка адміністрацыі Навабеліцкага раёна Гомеля, узгоднена на пасаду кіраўніка спраў Гомельскага аблвыканкама. Адбыліся перастаноўкі ў кіраўніцтве Нацыянальнага статыстычнага камітэта. Намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Цімафей Жыгараў прызначаны першым намеснікам старшыні Белстата. На яго месца прызначаны Аляксей Яркавец, начальнік галоўнага ўпраўлення статыстыкі цэн Нацыянальнага статыстычнага камітэта.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

# «МЫ НЕ ПРОСТА Ў ВАС ВЕРЫМ — МЫ ВАС ЛЮБІМ І ГАНАРЫМСЯ»

## Наталля Качанава ўручыла дыпломы выпускнікам з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі



Фота БелТА.

У гэты чацвер Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўрачыста сустракала гасцей — выпускнікоў Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій з ліку асоб з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі. Уручыць доўгачаканыя дыпломы, заслужаныя ўзнагароды і павіншаваць маладых людзей з заканчэннем вучобы прыехалі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН.

«Мы не проста ў вас верым — мы вас любім і ганарымся», — звяртаючыся да прысутных, адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.** — Вы зрабілі ўсё для таго, каб сёння, прайшоўшы шлях навучання, атрымаць спецыяльнасць. І, вядома, вы павінны ведаць, што ў нашай краіне вы ўсе нашы дзеці. Мы разам — адзіная сям'я. Прэзідэнт Беларусі самую сур'ёзную ўвагу ўдзяляе моладзі, дзецям і заўсёды гаворыць аб тым, што ў нашай краіне кожны малады чалавек можа рэалізаваць свае магчымасці і патрэбы. І, вядома, вельмі важна, што ў Беларусі ёсць такія выдатныя ўстановы, дзе працуюць такія цудоўныя людзі, якія аддаюць сваё сэрца і душу гэтым дзецям».

Спікер Савета Рэспублікі падзякавала педагогам і кіраўніцтву каледжа, бацькам — тым, хто зрабіў усё, каб гэтыя дзеці змаглі атрымаць спецыяльнасць: «Мікраэлектроніка, на мой погляд, — гэта так няпроста, так складана... Але гэта будучыня не толькі нашай краіны. Зусім нядаўна кіраўнік дзяржавы наведваў «Інтэграл» і гаварыў пра тое, наколькі сёння запатрабавана ў свеце мікраэлектроніка. У нашай краіне ёсць сур'ёзныя кампетэнцыі ў дадзеным кірунку. За гэтым — будучыня развіцця любой краіны».

У Беларусі робіцца ўсё для таго, каб кожны чалавек мог рэалізаваць свае магчымасці і патрэбы, сказала Наталля Качанава: «Прыняты законы, дзейнічае пастанова ўрада, усё неабходнае створана ў сістэмах аховы здароўя, адукацыі і сацыяльнай абароны. І мы разумеем, што нам трэба ісці яшчэ далей, каб гэтыя дзеці, атрымаўшы прафесію, пачалі паспяхова працаваць. Вельмі важна, каб у гэтым былі зацікаўлены нашы прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы. Таму я шчыра дзякую кіраўнікам прадпрыемстваў, якія падтрымліваюць гэтых дзяцей, не толькі прымаючы іх на работу, але і адсочваючы іх вучобу ў каледжы, дапамагаючы ім у гэтым».

У размове з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла: «Для нас няма чужых дзяцей. «Усе дзеці нашы», — так кажа Прэзідэнт. І гэта асноўная задача нашай сацыяльнай палітыкі. Чалавек, які жыве ў нашай краіне, павінен рэалізаваць усе свае магчымасці. Зыходзячы з тых зваротаў, якія паступаюць да нас, мы таксама сталі адсочваць, як рэалізоўваюцца гэтыя магчымасці. У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам у кожнага чалавека ёсць права на падтрымку ў сістэме аховы здароўя, сацыяльнай абароны і, вядома, пры атрыманні адукацыі. І смела магу запэўніць, што ў нашай краіне робіцца ўсё для таго, каб маладыя людзі маглі атрымаць спецыяльнасць і ў далейшым працаваць».

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін** адзначыў, што любая вучоба — гэта няпростая праца. «А спецыяльнасць «Мікраэлектроніка» — гэта дадатковыя складанасці, няпросты працэс. Але вы пераадолелі яго дзякуючы таму, што ў гэтай агульнай справе былі аб'яднаны намаганні многіх людзей, — сказаў ён выпускнікам. — Адчуваючы падтрымку іншага чалавека, абапіраючыся на яе, можна дасягнуць многага, і гэта мы бачым у маштабах працоўных калектываў, у навучальных аўдыторыях і ў маштабах усёй нашай краіны... Гэта новая радасць вашага жыцця — мець магчымасць дапамагаць іншым, адкрыць для сябе новыя шляхі і новыя гарызонты. У добры шлях! Шлях, які прайшлі вы разам, шлях, які мае добры працяг, і няхай Гасподзь благаслаўляе вас на ўсё добрае і карыснае!».

**Дырэктар Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій Георгій Козел** акцэнтаваў: «На апошнім пасяджэнні Усебеларускага народнага сходу Прэзідэнт нашай краіны акрэсліў адну са стратэгічных задач, якую трэба будзе нам вырашыць усім разам. У наступныя пяцігодкі мы павінны пабудаваць дзяржаву небывалага ўзроўню камфорту для яе жыхароў, і нам прыемна ўсведамляць, што наш калектыў, нашы навучэнцы бяруць самы актыўны ўдзел у рэалізацыі ўстаноўкі нашага нацыянальнага лідара. Нам прыемна, што тры гады запар уручэнне дыпломаў навучэнцам з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі адбываецца з удзелам Старшыні Савета Рэспублікі і ўладыкі Веніяміна ў самых прыгожых залах сталіцы. Гэта робіцца для таго, каб даць сігнал усяму беларускаму грамадству: не бывае чужых людзей і не бывае ў нашай дзяржаве чужых праблем».

Паводле яго слоў, у каледжы ўпершыню пачалі навучаць дзяцей з расстройствам аўтыстычнага спектра: «Мы адкрылі першы ў сістэме прафесійнай адукацыі краіны Цэнтр духоўна-маральнай інклюзіўнай культуры. На сёння там было праведзена 15 міжнародных канферэнцый, 12 міжнародных семінараў, больш за 20 рэспубліканскіх семінараў і нарад па тэме інклюзіўнай адукацыі. Гэты цэнтр мы ствaралі не проста так. Мы дзелімся вопытам і разумеем, што не павінны спыняцца на дасягнутым. Сёлета будзем ажыццяўляць зусім незвычайны, новы для нас праект — фарміраваць набор татальна невідушчых дзяцей з расстройствам аўтыстычнага спектра, з парушэннем слыху, маўлення і парушэннямі апорна-рухальнага апарату. На жаль, нам няма дзе паглядзець падобны вопыт — і мы зноў будзем першапраходцамі ў гэтых пытаннях».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

### У тэму

У жніўні 2024 года ў Мінскім дзяржаўным каледжы лічбавых тэхналогій адбылося пасяджэнне кансультатыўнага савета пры Савеце Рэспублікі па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. На ім удзельнікі пасяджэння на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай разгледзелі пытанні прафесійнай падрыхтоўкі маладых людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і стварэння ўмоў для іх сацыялізацыі на прыкладзе работы горада Мінска. Дарэчы, адбылося ўжо пяць пасяджэнняў экспертна-кансультатыўнага савета пры Савеце Рэспублікі па дадзенай тэме.

ПАДРЫХТОЎКА ДА СВЯТА

# ПАРАД З Т-34 І МАШТАБНАЯ ВЫСТАЎКА

## Аляксандр Турчын: «Кіраўніком дзяржавы адобраны падыходы да правядзення святкавання 80-годдзя Вялікай Перамогі»

Чарговае пасяджэнне рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне прайшло ўчора ў Доме ўрада пад старшынствам прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына.



— Сёння ў нас чарговае пасяджэнне аргкамітэта. Не так шмат застаецца часу да святкавання 80-годдзя Вялікай Перамогі. Многія пытанні ўжо вырашаны, падыходы да правядзення мерапрыемства падтрыманы і адобраны кіраўніком дзяржавы. Прынята пастанова ўрада аб аказанні матэрыяльнай дапамогі (ветэранам. — **Заўв. аўт.**), — нагадаў прэм'ер-міністр.

Таму ён акцэнтаваў увагу выступоўцаў на неабходнасці агучыць пытанні, якія не вырашаны, і пазначыць, што неабходна для іх вырашэння.

— Я б хацеў пачуць, як ідуць работы па падрыхтоўцы выстаўкі, прысвечанай 80-годдзю Вялікай Перамогі, — дадаў ён.

Дэталямі з журналістамі падзяліўся памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Мінабароны, генерал-маёр Леанід Касінскі:

— Упершыню грамадзяне на парадзе ўбачаць дастаткова шырокую лінейку менавіта рэтрапарада, гістарычнай яго часткі з удзелам розных узораў узбраення, ваеннай тэхнікі ваенных гадоў.

Паводле яго слоў, у цяперашні час шыецца форма адзення ваенных гадоў для тых, хто будзе прымаць удзел непасрэдна ў гістарычнай частцы парада.

— Рыхтуецца тэхніка, ужо прыбылі з Расійскай Федэрацыі танкі Т-34. Актыўна ўзаемадзейнічаем з прадстаўнікамі малога бізнесу. І павінен адзначыць, яны на бязвыплатнай аснове даюць наяўныя ў іх узоры тэхнікі, узбраення менавіта часоў Вялікай Айчыннай вайны для таго, каб прадставіць шырокай грамадскасці ў ходзе правядзення ваеннага парада.

Першы намеснік міністра культуры Дзмітрый Шляхцін дадаў, што актыўная фаза рэпетыцыйнага працэсу парада, якая будзе бачная грамадскасці, пачнецца з красавіка.

— Усе рашэнні, неабходныя для арганізацыі правядзення цэнтральных мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, ужо прыняты. Цяпер мы актыўна працуем над іх рэалізацыяй, — акцэнтаваў увагу ён.

Што датычыцца Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, яго асноўная задача, па словах першага намесніка міністра, — арганізацыя гістарычнага блока выстаўкі на плошчах Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра:

— Тут работа таксама ідзе досыць інтэнсіўна. Будуць маленькія сюрпрызы, таму што гэта чакаецца не зусім звыклая музейная экспазіцыя, якую мы бачылі ў самім музеі вайны. Будзе выстаўка, насычаная рознымі інтэрактыўнымі мультымедыйнымі тэхналогіямі, якія спецыяльна ствараюцца для яе, у тым ліку кантэнт.

Першы намеснік міністра культуры растлумачыў, што гэта тое, чаго раней нідзе не было:

— Мы з дапамогай тэхналогій нават ажывім аднаго героя партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі, якога раней мы ведалі толькі па фотаздымках, а цяпер з'явіцца магчымасць убачыць яго ў выглядзе галаграмы.

# КРОКІ ДА ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ

## Прэм'ер-міністр: «Пры падрыхтоўцы нарматыўных прававых актаў трэба ўлічваць меркаванне бізнесу»

Кіраўнік урада Аляксандр ТУРЧЫН учора, 27 сакавіка, правёў нефармальную сустрэчу з членамі Савета па развіцці прадпрымальніцтва і прадстаўнікамі партнёрскіх бізнес-саюзаў. На парадку дня значылася бягучая сітуацыя ў эканоміцы і прыватным сектары. Аляксандр Турчын таксама пацікавіўся меркаваннем бізнесу аб вектарах развіцця ў будучай пяцігодцы.

Адкрываючы пасяджэнне савета, прэм'ер-міністр задаў вектар гутаркі:

**— Адразу некалькі пытанняў, чым абумоўлена сёння наша нефармальная сустрэча. Падкрэсліваю, Савет па развіцці прадпрымальніцтва ў нас узначальвае Мікалай Генадзьевіч (Снапкоў, першы віцэ-прэм'ер. — Заўв. аўт.), таму пытанне — пагаварыць аб бягучай сітуацыі ў эканоміцы, бізнесе. І яшчэ вельмі важнае: наперадзе ў нас наступная пяцігодка — хацелася б абмяняцца думкамі, (даведацца. — Заўв. аўт.) ваша бачанне, тых пунктаў росту, праблем, якія нам неабходна вырашаць, каб у наступнай пяцігодцы мы зрабілі істотны крок наперад у развіцці нашай краіны.**

Прэм'ер-міністр растлумачыў, што ўлада павінна абапірацца на меркаванне бізнесу ў тых ці іншых пытаннях, якія датычацца падрыхтоўкі новых нарматыўных прававых актаў, ацэнкі іх рэгуляцыйнага ўздзеяння, існуючых праблем:

— Таму я ўпэўнены, што савет будзе працаваць у патрэбным рэчышчы. І на нядаўняй нарадзе ў кіраўніка дзяржавы Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння савету неабходна акумуляваць праблемы, і тыя з іх, якія патрабуюць вырашэння на ўзроўні Прэзідэнта, павінны дакладвацца ад Савета па развіцці прадпрымальніцтва.

**Што абмяркоўвалі на сустрэчы? З журналістамі падзяліўся дырэктар ТАА «Кіруючая кампанія «Інтэлект» Сяргей ВАРЫВОДА:**

— Абмяркавалі меры па ўдасканальванні прадпрымальніцкай дзейнасці, якія б дазволілі зрабіць нашу эканоміку больш эфектыўнай, наша прадпрымальніцтва — больш эканамічна развітым. Таму гаворка ішла ў асноўным аб пунктавых, а таксама сістэмных мерах па развіцці прадпрымальніцкага клімату ў краіне.

На думку суразмоўцы, вельмі важна весці дыялог паміж урадам і прадпрымальніцкімі саюзамі на этапе падрыхтоўкі нарматыўных прававых актаў:

— Ад гэтага якасць і эфектыўнасць нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць нашу дзейнасць, будзе толькі вышэйшай.

На сустрэчы таксама ацанілі і негатыўны ўплыў санкцыйнага ціску на Беларусь, абмеркавалі і спосабы яго мінімізацыі, якім чынам стаць паспяховымі на рынках знешніх краін.

— Нацыянальны бізнес гатовы канкурыраваць не толькі на знешніх рынках, але і на ўласным рынку з інвестарамі з дружалюбных краін і з прадпрымальнікамі, магчыма, недружалюбных краін, калі яны прымуць такое рашэнне. Мы не баімся канкурэнцыі, — запэўніў Сяргей Варывода.

# ПУНКТЫ РОСТУ

## Мінэканомікі: «Неабходна падтрымліваць набраны тэмп росту інвестыцый»



Пра гэта паведаміў міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР падчас нядаўняй рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць.

У Ганцавіцкім раёне ён наведаў завод «Брэстжылбуд», дзе азнаёміўся з работай прадпрыемства, правёў сустрэчу з працоўным калектывам, абмеркаваў бягучую эканамічную сітуацыю і адказаў на пытанні супрацоўнікаў, расказалі ў прэс-службе Мінэканомікі.

— У першыя два месяцы года адзначаецца апераджальны рост ключавых паказчыкаў — ВУП, інвестыцый і даходаў насельніцтва. Для далейшага развіцця вельмі важна падтрымаць дынаміку, — падкрэсліў міністр.

Ён патлумачыў, што з гэтай мэтай у краіне паслядоўна ўдасканальваюцца інстытуцыйныя механізмы падтрымкі інвестыцый і ствараюцца ўмовы для прыцягнення капіталу ў перспектыўныя праекты рэальнага сектара эканомікі.

— Сёння кожнае прадпрыемства незалежна ад формы ўласнасці можа выкарыстоўваць гэтыя інструменты для тэхналагічнага абнаўлення, асваення новых відаў прадукцыі і павышэння канкурэнтаздольнасці. Пры гэтым асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць выкарыстанню ўласнай сыравіннай базы і высокай лакалізацыі, — дадаў Юрый Чабатар.

Міністр таксама правёў прыём грамадзян у Ганцавіцкім райвыканкаме, пасля чаго ў Баранавіцкім раёне азнаёміўся з ходам будаўніцтва першай чаргі індустрыяльнага парка «Бурштын». Дарэчы, гатоўнасць аб'екта складае 80 %, ужо адабраны першыя тры рэзідэнты.

— Гэта пілотная пляцоўка павінна стаць пунктам росту рэгіёна. Яе вопыт будзе выкарыстаны для маштабавання ў іншых раёнах краіны, — адзначыў кіраўнік эканамічнага ведамства.

Юрый Чабатар таксама наведаў ТАА «Мідэа Рэфрыжэратар Мануфактурынг», дзе ствараецца сумесная беларуска-кітайская вытворчасць халадзільнікаў і маразільнікаў. З кіраўніцтвам прадпрыемства міністр абмеркаваў ход рэалізацыі праекта.

# ПАЗНАЙ БЕЛАРУСЬ!

## Даслоўна

— У сваім выступленні на інаўгурацыі кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на развіццё турызму ў Рэспубліцы Беларусь, — падкрэсліў, адкрываючы XXVII міжнародную выстаўку-кірмаш турыстычных паслуг «Адпачынак-2025» **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК**. — У найбліжэйшыя пяць гадоў турызм павінен стаць драйверам эканомікі, прыярытэтам эканамічнага развіцця нашай краіны. Мы адкрытыя, каб людзі з усіх краін прыязджалі да нас і бачылі гэту прыгажосць, якой кожны рэгіён багаты па-свойму. Тое, што нясём свету, што ў сэрцы кожнага беларуса: мы хочам сябраваць, мець зносіны, узаемна ўзбагачацца культурамі і традыцыямі.



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Маштабны праект на адной выставачнай пляцоўцы ў 10 тысяч кв. м. сабраў неверагодна шырокі спектр турыстычных прапаноў. Больш за 500 экспанентаў з розных краін свету прадстаўляюць гэтымі днямі турыстычныя маршруты. Сярод краін-удзельніц — Узбекістан, Тайланд, Турцыя, Кыргызстан, Куба, упершыню ў беларускую сталіцу прыбылі тураператары з Амана, а таксама (у ліку 16 расійскіх рэгіёнаў) — з Кабардзіна-Балкарыі. Але, мабыць, ярчэй за ўсіх на XXVII Міжнароднай выстаўцы-кірмашы турыстычных паслуг «Адпачынак-2025» пазіцыянуе сябе гаспадыня форуму — Беларусь. Кожны рэгіён знаёміць са сваімі найбольш каларытнымі гранямі.

### «БЕЛАРУСКІ ХОГВАРДС» І МАЛАЯ РАДЗІМА МАШЭРАВА

— Куды паехаць? Вядома ж, у Полацк! Наш старадаўні горад — калыска праваслаўя ў Беларусі, — кажа супрацоўніца Полацкага раённага цэнтра культуры Тацццяна Захаранкава. — Сёлета адзначаем 900-годдзе знакамітага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Запрашаем усіх! Будзе вялікае свята.

Суразмоўніца распавядае, што падчас нядаўняй рэстаўрацыі ў манастыры быў адкрыты ніжні пласт фрэсак, які датуецца XII стагоддзем. Але не зніклі і пазнейшыя (але ўсё роўна старадаўнія) пласты жывапісу: фрэскі рэстаўратары беражліва «перакаталі» на дошкі, і іх таксама могуць убачыць турысты.

А яшчэ ў Полацку ёсць універсітэт, былы езуіцкі калегіум, заснаваны ў 1581 годзе. Яго празвалі «Беларускі хогвардс»: там мноства старадаўніх «магічных артэфактаў». Напрыклад, «галава старца» ўражвала гасцей калегіума больш за два стагоддзі таму і працягвае рабіць гэта ў нашы дні. Старац дае парады і прадказвае будучыню. Або дубовыя дзверы рэктарскага ўвахода, якія адкрываюцца толькі двойчы ў год. А таксама ўнікальны гадзіннік: падобныя ганарацца Кракаў і Прага. Сёння па ўніверсітэце водзяць экскурсіі, кажа яго супрацоўнік і экскурсавод Марына Бурлакова. І







# ЗАРАДНЫЯ СТАНЦЫІ ДЛЯ ЭЛЕКТРАМАБІЛЯЎ, ЗОНЫ АДПАЧЫНКУ

## Куды рухаецца прыдарожны сэрвіс?

Сёлета ў Беларусі плануецца пабудаваць каля 200 зарадных станцый для электрамабіляў. Яны размесцяцца не толькі ў Мінску, але і на аўтазапраўках і дарогах агульнага карыстання, а таксама ў абласных і раённых цэнтрах. Таксама будзе пабудаваны і рэканструяваны шэраг аўтазаправак. Спецыялісты расказалі, якія аб'екты прыдарожнага сэрвісу з'явяцца ў краіне і якія іх паслугі сёння найбольш запатрабаваны.



### ХАРЧАВАННЕ, ЗАПРАЎКА, АДПАЧЫНАК

Прыдарожны сэрвіс у Беларусі ўдасканальваецца згодна з зацверджанай генеральнай схемай развіцця прыдарожнага сэрвісу на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах на 2021—2025 гады. Сёлета вядзецца яе карэкціроўка з уключэннем прапанаваных Міністэрствам спорту і турызму аб'ектаў для дэманстрацыі турыстам уздоўж рэспубліканскіх дарог. Таксама сёлета будзе пачата распрацоўка новай генеральнай схемы на 2026—2030 гады на падставе прапаноў аблвыканкамаў, канцэрна «Белнафтахім» і іншых уладальнікаў аб'ектаў сэрвісу.

Самымі запатрабаванымі паслугамі прыдарожнага сэрвісу з'яўляюцца харчаванне і наведванне санітарных аб'ектаў, запраўка аўтамабіля, адпачынак. Большасць аб'ектаў прапаноўваюць цэлы комплекс паслуг, якія могуць уключаць пражыванне, душ і мыццё адзення, стаянкі для легкавых і вялікагрузных машын, караванераў, кемпінгі з магчымасцю прыгатаваць ежу самастойна, месцы для дзіцячага вольнага часу, доступ да інтэрнэту па Wi-Fi, зарадка мабільных тэлефонаў і інш.

### УВАГА ЭСТЭТЫЦЫ

Толькі на тэрыторыі Мінскай вобласці дзейнічае 351 аб'ект харчавання, гандлю і прыдарожнага сэрвісу. Як паведаміла намеснік **начальніка галоўнага ўпраўлення гандлю**

## ОАО «Белювелирторг»

г. Минск, ул. Смоленская, 33, УНП 100129348

### Бухгалтерский баланс за 2024 год

(тыс. руб.)

| АКТИВ | Код строки | На 31.12.2024 | На 31.12.2023 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | | | |
| ИТОГО по разделу I | 190 | 38 492 | 35 616 |
| II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | | | |
| ИТОГО по разделу II | 290 | 115 642 | 113 647 |
| БАЛАНС (190 + 290) | 300 | 154 134 | 149 263 |
| ПАССИВ | Код строки | На 31.12.2024 | На 31.12.2023 |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| ИТОГО по разделу III | 490 | 62 576 | 57 922 |
| IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| ИТОГО по разделу IV | 590 | 507 | 543 |
| V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| ИТОГО по разделу V | 690 | 91 051 | 90 798 |
| БАЛАНС (490 + 590 + 690) | 700 | 154 134 | 149 263 |

### О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2024 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2024 года | За январь – декабрь 2023 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 79 457 | 68 497 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 4 018 | 4 108 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 - 080) | 090 | 3 291 | 3 731 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140) | 140 | (855) | (873) |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±090 ±150) | 150 | 1 980 | 2 418 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200 – 250 – 260 – 270) | 210 | 1 530 | 1 810 |

### Пункты 4–9 «Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности»

Количество акционеров ОАО «Белювелирторг» – 2, в том числе юридических лиц – 1

| Наименование показателей | Ед. изм. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров всего, в том числе юридических лиц | лиц | 2/1 | 2/1 |
| Комунальная собственность – доля в уставном фонде | % | 44,96 | 44,96 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 457,04 | 485,07 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 0,10 | 1,11 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 14,32 | 13,25 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | | |
| Просроченная дебиторская задолженность | млн. руб. | 36 | 3 |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн. руб. | 1313,00 | 1710,00 |

Среднесписочная численность работающих (человек) – 511. Основной вид деятельности – розничная торговля ювелирными изделиями

**Директор** **А.С. Мишуто**
**Главный бухгалтер** **Н.В. Комар**

### Итоговая часть аудиторского заключения

Отчетность ОАО «Белювелирторг» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение аудируемого лица на 31.12.2024 а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения аудируемого лица за 2024 год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.
**Общество с ограниченной ответственностью «Мир аудита» Св. гос. рег. № 193576020 от 27.07.2021 г.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРЯМОЙ ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ДОМА

*В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»*

**ПРОДАЁТСЯ**

**одноэтажный бревенчатый одноквартирный жилой дом, общей площадью жилых помещений 30 м², с хозяйственными постройками,**
расположенный по адресу: **д. Новоселье, ул. Центральная, д. 15 Березинского района Минской области.**

Цена пустующего жилого дома: одна базовая величина **42,00** (сорок два белорусских рубля 00 копеек) с дополнительной компенсацией расходов, связанных с продажей дома.
С подробной информацией о продаже дома можно ознакомиться на официальном сайте Березинского районного исполнительного комитета.
Тел. 801731420,
Дмитровичский сельский исполнительный комитет.

УНП 600036574

паралельна тут працягваюць, як і амаль пяць стагоддзяў таму, вучыцца студэнты.

Турыстычны комплекс «Утрына» з Глыбоцкага раёна запрашае на каністэрапію: псіхолагі тут лечаць стрэсы, дэпрэсіі, трывожнасць і гаджэт-залежнасць у дзяцей і дарослых у супрацоўніцтве са спецыяльна навучанымі хаскі. Адзін з пухнатых дактароў — прыгажун Шэйла — з задавальненнем пазіруе перад камерамі.

Сенненскі раён расказвае наведвальнікам стэнда пра сваіх знакамітых землякоў — напрыклад, менавіта там малая радзіма Пятра Машэрава. І менавіта тут жыла аўтар арнаменту, які сёння можна ўбачыць на дзяржаўным сцягу нашай краіны.

— Арыгінал яе ручніка захоўваецца ў нашым музеі, а на выстаўку мы прывезлі копію: майстры палічылі кожную ніточку, выткалі і вышылі ручнік па старадаўняй тэхналогіі, — заўважае народны майстар Беларусі Вольга Квашко.



## ЗГУШЧОНКА І БАНКУХА

Рагачоўская згушчонка — гэта брэнд, прычым як у нашай краіне, так і за яе межамі. А яшчэ ў Рагачове неўзабаве адкрыецца найцікавейшы музей мясцовай яўрэйскай культуры, расказаў начальнік аддзела спорту і турызму горада Ігар Хадзько. Аднаўляецца старадаўні Касцёл Святога Антонія. Але самая, мабыць, прывабная турыстычная сфера для гасцей Рагачова — гастратурызм.

— Кожны чацвер ва ўсіх нашых кафэ праходзіць Дзень беларускай кухні. Прычым прапануюцца рэгіянальныя стравы, і гэта не толькі дранікі. Прыязджайце пакаштаваць! — кажа суразмоўца.

Дарэчы, частуюць у Рагачове не толькі за грошы — па чацвяргах праводзяцца і бясплатныя дэгустацыі, дадае ён.

Гастранамічны турызм — адзін з кірункаў, які рэгіёны сёння развіваюць вельмі актыўна. Магілёўшчына на выстаўцы частуе вэнджаным карпам і мясам у гліняных збанках, а Міншчына — пітным мёдам па аўтэнтычных рэцэптах, які разлівае з бочачак манах Ёран.

— Прыязджайце ў Свіслач! — раіць загадчыца сектара турызму Свіслацкага райвыканкама Алена Панізнікава. — Гэта самае цудоўнае месца ў Беларусі! Мы — паўночныя вароты Белавежскай пушчы: 50 % нашага раёна — дзікі тысячагадовы лес. З аднаго боку, інтэрнэт і мабільная сувязь, з другога — дзікая прырода. І гэта вельмі ўплывае на нашу мясцовую культуру і рытм жыцця. І на нашу рэгіянальную кухню!

Толькі тут можна пакаштаваць дзясяткі відаў салёных грыбоў, сотні варыянтаў страў з ягад. І нават мясцовы чай:

— Напрыклад, вось такі: скрыпень з пушчы аднаго года ферментацыі. Спрабуйце!

Алена расказвае пра ўнікальную мясцовую страву — банкуху. Гэта велізарны каравай, які пякуць... на палцы. У рэцэпт уваходзіць 60 яек, кілаграм масла, а захоўваецца такі хлеб усю зіму.

Петрыкаўскі раён запрашае на Пціч: тут праходзіць знакаміты фестываль «Кліч Палесся», тут музей дзеда Талаша, тут сплаўляюцца на байдарках аматары экстрэмальнага спорту і можна наведаць сафары-парк. Рэгіён развівае прамысловы турызм.

## МІНУЛАЕ: ДАЛЁКАЕ І БЛІЗКАЕ

— Куды беларусу паехаць у Беларусі? Лідскі замак, адназначна! Беларусь, вядома, краіна замкаў, але наш, Лідскі, — сапраўдная жамчужына. Калі вам кажа пра гэта сам Францыск Скарына, наўрад ці паспрачаешся, — кажа гісторык Алесь Хітрун на выстаўцы — у вобразе вялікага першадрукара.

— Ён распавядае, што Дзень беларускага пісьменства сёлета будзе праходзіць у Лідзе: гасцей свята чакае мноства цікавых лакацый і актыўнасцяў.

Брэст — гэта, вядома, Брэсцкая крэпасць.

— Адзін раз наведаць гэты аб'ект мала. Каб зразумець усю глыбіню экспазіцыі, трэба пабываць у Брэсцкай крэпасці не раз і не два, — пераконвае ўдзельнік ваенна-гістарычнага клуба «Гарнізон» Аляксандр Радаман.

Ён адзначае, што 22 чэрвеня яго клуб штогод рэканструіруе першы дзень бою абаронцаў крэпасці з фашыстамі. А яшчэ на брэсцкім стэндзе можна пагаварыць са знакамітым брэсцкім ліхтаршчыкам, таксама сімвалам горада.

У Баранавічах цікава, напрыклад, пабываць на начным квэсце, які арганізоўвае Музей чыгункі. Толькі прыхапіце з сабой ліхтар, гэта пропуск у гульню.

— Паравоз сышоў, эра пары змянілася эпохай сучасных цягнікоў, але засталіся машыніст і памочнік машыніста, — кажа навуковы супрацоўнік музея Наталля Ярашына. — А трэцім у брыгадзе раней быў качагар. Яго мы і будзем шукаць у святле ліхтароў. А ён будзе падказваць нам падказкі і сляды.

Наша краіна робіць стаўку на ўязны і ўнутраны турызм. І небеспадстаўна: беларускай зямлі ёсць што паказаць і чым ганарыцца.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# ДЫСТАНЦЫЙНЫ ЗАКАЗ ЕЖЫ,

**і паслуг Мінаблвыканкама Дзіна ЛЕШЧАНКА,** летась у рэгіёне адкрыта пяць аб'ектаў грамадскага харчавання і гандлю на тэрыторыі Барысаўскага, Смалявіцкага і Крупскага раёнаў. Сёлета таксама плануецца адкрыць адзін комплексны аб'ект грамадскага харчавання на аўтадарозе Р-1.

Пераважна аб'екты прыдарожнага сэрвісу размяшчаюцца на рэспубліканскіх і міжнародных аўтамабільных дарогах. Сёння вялікая ўвага ўдзяляецца іх эстэтыцы: выкарыстоўваецца сучаснае абсталяванне, афармляюцца ландшафтныя зоны і зоны для адпачынку дзяцей, безбар'ернае асяроддзе, арганізоўваюцца зоны прыёму ежы на вуліцах. У многіх аб'ектах можна скарыстацца паслугамі папярэдняга заказу ежы і пакупкі прадуктаў і страў на вынас.

Шырокі комплекс паслуг можна атрымаць і на аўтазапраўках. Толькі ў вытворчага аб'яднання «Беларуснафта» маецца 576 такіх аб'ектаў па ўсёй краіне.

— Сёння не так актыўна, як у папярэднія гады, будуюцца новыя аўтазаправачныя станцыі, а ідзе іх рэканструкцыя, што павышае якасць сэрвісу, павялічвае колькасць аб'ектаў грамадскага харчавання і гандлёвія плошчы, — расказаў **намеснік генеральнага дырэктара па забеспячэнні вуглевадароднай сыравінай і рэалізацыі прадуктаў РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» Сяргей КАМОРНІКАЎ.**

Летась было комплексна рэканструявана 11 аўтазапраўак, сёлета планецца правесці рэканструкцыю 13 і пабудаваць тры новыя — у Віцебскай вобласці і Мінску. У апошнія гады пашыраюцца магчымасці запраўкі новым відам паліва — прапанам-бутанам аўтамабільным, больш экалагічным і эканамічным відам паліва. Менавіта такія новыя аб'екты будуюцца па краіне. Летась «Беларуснафта» адкрыла 10 аўтагазазаправачных станцый на тэрыторыі дзейных АЗС, сёлета з'явіцца яшчэ шэсць. Усяго ж у краіне каля 250 газазаправачных станцый.

## СЕТКА ЗАРАДНЫХ СТАНЦЫЙ «МАЛАНКА» ІСТОТНА ПАШЫРЫЦЦА

Новы від машын, электрамабілі, таксама патрабуюць новых зарадных станцый. «Беларуснафта» з'яўляецца найбуйнейшым дзяржаўным аператарам зараднай сеткі «Маланка». На цяперашні час у ёй 747 адзінак зарадных станцый. У сёлетніх планах — пабудаваць яшчэ каля 200, у тым ліку каля 70 — у Мінску, астатнія з'явяцца на аўтадарогах агульнага карыстання, у абласных і раённых цэнтрах. З'явяцца таксама 23 суперхуткія зарадныя станцыі, якія сёння найбольш запатрабаваны і дазваляюць на адным аб'екце адначасова зарадзіць некалькі электракараў.

Акрамя запраўкі палівам АЗС прапаноўваюць шырокі спектр паслуг: магазіны, кафетэрыі, паслугі страхавання і аплаты праезду па платных дарогах, стаянкі, арэнды прычэпаў, падпампоўка шын, пляцоўкі для караванінгу, мыйкі, СТА. Вялікая ўвага — развіццю грамадскага харчавання. Дзейнічае сетка кафетэрыяў пад брэндам «Заўжды цікава», дзе прадстаўлены не толькі фастфуд, але і стравы беларускай кухні. Пад гэтым жа брэндам працуе і сетка фудтракаў, якая добра сябе зарэкамендавала на кірмашах і фестывалях, у прыватнасці на «Марафоне адзінства».

— Статыстыка сведчыць, што людзі ўсё больш давяраюць аб'ектам грамадскага харчавання. Летась мы рэалізавалі больш за 16 мільёнаў кубкаў гарачых напояў і 7 мільёнаў хот-догаў, гэта нашы рэкорды, якія сведчаць аб даверы спажыўцоў, — адзначыў Сяргей Камарнікаў.

**Алена КРАВЕЦ.**


**СЕМЕЙНАЯ ПСИХОЛОГИЯ,**
**сохранения отношений в паре, в семье, работа с зависимостями** и многое другое.
Открываю вам дорогу на счастье, на любовь, на семью.
**Ваш психолог Тамара.** Тел. 8 (029) **3477306**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона**: ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 | | | |
| **Продавец:** ООО «Гастон Восток», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 165а | | | |
| **№ лота** | **Предмет аукциона, расположенный по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 165А** | **Начальная цена без НДС, бел. руб. (снижена на 20 %)** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
| 1 | **Легковой автомобиль внедорожник универсал Geely Emgrand X7, г. в. 2015** | 7 360,00 | 368,00 |
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **15.04.2025** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** | | |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **11.04.2025** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** | | |
| **Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Шуляк Артур Леонидович, тел. 8029-123-39-49 | | | |
| **С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайтах организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by** | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Срок оплаты:** не более 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи | | | |
| **Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by** | | | |
| В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 % | | | |
| **Затраты** и вознаграждение (8 % от цены продажи (подробная информация в карточке лота на сайте организатора торгов)) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов | | | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.03.2025 г. | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 44 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** | | |



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Большевик-Агро»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 30.04.2025 в 10.00.**

**Лот № 1:** Здание бани
с инв. № 644/С-58829, 268,5 кв. м.
Адрес: Минская обл., Солигорский р-н,
Краснодворский с/с, аг. Кривичи, ул. Центральная, 1.

Начальная цена с НДС 20 % – 64 440,00 руб.
Задаток – 644,00 руб.

Капитальное строение с инвентарным номером 644/С-58829 расположено на земельном участке с кадастровым номером 625082303101000962 (площадь 0,2488 га). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **25.04.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# ПАРАСТКІ Ў ЦАНЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пакуль у продажы ў асноўным расада кветак, лекавых і духмяных раслін, дэкаратыўных кустоў, а таксама клубніц, суніц і «суніц-клубніц» (пра іх раскажам ніжэй). Расада гародніны — памідораў, агуркоў, баклажанаў, кабачкоў, гарбузоў і г. д. — пойдзе пазней, тлумачаць прадаўцы. Актыўны гандаль ёю разгорнецца бліжэй да сярэдзіны красавіка. З-за пагрозы начных замаразкаў — звычайнай вясновай праблемы беларускіх агароднікаў — яе сеюць крыху пазней, чым «дэкаратыўку», інакш расада перарасце раней, чым прыйдзе час высаджваць яе ў грунт.

У вытворцаў расады існуе дакладны падзел: хтосьці займаецца толькі гароднінай, хтосьці — выключна дэкаратыўнымі раслінамі, лекавымі. Іншыя пачынаюць гандаль расадай ранней. Зрэшты, на зеляніну — цыбулю «на пяро», кроп-пятрушку — такі падзел «сфер уплыву» не распаўсюджваецца, і гэта расада ўжо напоўніцу прадаецца.

## «ДЛЯ ГЭТАЙ СПРАВЫ ПАВІНЕН БЫЦЬ ТАЛЕНТ...»

— Гваздзік ужо можна высаджваць. Два дні патрымаеце, пакуль холадна (у нас гэтымі днямі добры мароз быў!), і высаджвайце, — дае рэкамендацыі прадавец. — Адна скрыначка — адзін кусцік. А ўжо на наступны год дзяліце. Можна чаранкаваць.



Гваздзік суразмоўніца прадае па 10 рублёў за скрынку, герань — па 12. Прадавец за суседнім прылаўкам, Ірына, расказвае, што гандлюе расадай на Камароўцы кожную вясну і ў яе гадавальніка ўжо напрацаваны пастаянныя кліенты.

— Пакупнікам наша расада вядомая, яны кажуць: гэта расада з гадавальніка ў Дзяржынску. А назвы ў майго гадавальніка няма, не прыдумала, — дае тлумачэнні Ірына. — Я свой гадавальнік усё жыццё збірала. Што ў нас ёсць? Усё, што бачыце на прылаўку. Гэта размарын, па 8 за кусцік. Гэта гартэнзія. А гэта фарзіцыя — белая і жоўтая.

Фарзіцыя вясной зацвітае першай: раскошныя буйныя кветкі на голых яшчэ галінках, заўважае яна. Жоўтая — яркая і кідкая, але без паху. Белая ніжэйшая і не так кідаецца ў вочы, затое духмяная. Пах, дарэчы, вельмі тонкі (саджанцы Ірына прадае ўжо з кветачкамі), быццам дарагой парфумы. Парадак цэн на фарзіцыю — ад 8 да 35 рублёў у залежнасці ад памеру і сорту.

Лісця ў фарзіцыі пакуль няма, але прадавец можа пра іх расказаць:

— У «жоўтых» сартоў кветкі розных тонаў. Бачыце: у аднаго саджанца — лімонныя, а ў другога — колеру сланечніка. І форма кветак розная. У аднаго — доўгія пялёсткі, у другога — больш круглявыя. І лісточкі ў іх будуць розныя: тут — зялёны ліст з жоўтай аблямоўкай. Калі куст адцвіце, усё роўна будзе вельмі прыгожым. А тут лісточак будзе проста зялёны, — тлумачыць яна пакупніцы.

Магнолій у маёй суразмоўніцы ўжо няма, прадала — на іх вялікі попыт. Будуць праз тыдзень, запэўнівае. Сёлета магнолію прадаюць па 20 рублёў за кусцік. Саджанцы лаванды і размарыну ідуць па адной цане — 10 рублёў, шалфею — ад 12 да 18.

— Часцей за ўсё пакупнікі пытаюцца пра духмяныя расліны: чабор, лаванду, мяту, шалфей, бергамот і гэтак далей, — кажа Ірына. — У апошнія гады многія на сваіх участках вырошчваюць лекавыя расліны, яны таксама карыстаюцца попытам. Актыўна купляюць дэкаратыўныя хмызнякі — вейгелу, дэйцыю. Карыстаюцца попытам розныя сарты буйналіставых гартэнзій, калі яны рэмантантныя, то-бок цвітуць на парастках бягучага года. Калі гартэнзія цвіце на леташніх парастках, яна менш цікавіць пакупніка.

Каштуе гэта расліна ад 15 да 30 рублёў, гартэнзія мяцёлчатая таннейшая за іншыя: ад 10 да 30 рублёў у залежнасці ад сорту і памеру саджанца. У цэлым, чым навейшы сорт і чым буйнейшы парастак, тым ён даражэйшы.



Сёння ў гадавальнікаў вялікі выбар саджанцаў бэзу — у сярэднім 30—40 рублёў за кусцік. Сартоў — дзясяткі. Махровы бэз самы дарагі.

— У крамах яшчэ даражэйшы, — каментуе прадавец.

Ёсць і ўцэненыя: калі саджанец не занадта прыгожа сфармаваўся, цана зніжаецца амаль у палову.

— Але корань тут добры, кусцік хутка пойдзе ў рост, — тлумачыць Ірына.

Пакупнікі дэкаратыўных раслін, як і можна было меркаваць, у асноўным жанчыны.

— Маладыя дзяўчаты часцей за ўсё бяруць першацветы, — кажа суразмоўніца. — Ёсць нейкі працэнт мужчын, у асноўным дачнікі. Але большасць, вядома, жанчыны сярэдняга ўзросту — і дачніцы, і з сельскай мясцовасці, у каго свой дом.

— А чаму б не вырасціць расаду самім?

— Калі, напрыклад, браць цыбульныя (тыя ж першацветы) — пра гэта трэба было паклапаціцца загадзя, яшчэ ўвосень. Цыбульныя трэба купляць або ўвосень цыбулінай, або цяпер з кветкай.

— А іншыя саджанцы? Тую ж зеляніну, напрыклад?

— Каб вырасціць добрую расаду, патрэбен талент. Не ва ўсіх атрымліваецца. Трэба ведаць шмат тонкасцяў. Размарын, напрыклад, прадаецца ў насенні, але насенне практычна не ўзыходзіць. Я размнажаю яго чаранкамі. Але насенне прадаецца, людзі купляюць, робяць некалькі спроб і прыходзяць да нас па расаду. Мы прапануем больш устойлівыя і непатрабавальныя ці больш новыя і прыгожыя сарты пад розныя запыты.

## ПРАЦАЁМКІ ПРАЦЭС

Вікторыя прадае расаду са Смалявіч, яе асартымент — таксама «дэкаратыўка», але галоўным чынам ягадная. Парасткі клубніц-суніц — аднаго памеру, здаровыя, нагадваюць салдат на парадзе. Каштуе адзін такі саджанец ад 3-3,50 да 5 рублёў у залежнасці ад сорту: чым больш запатрабаваны пакупніком сорт, тым, адпаведна, даражэйшая расада. Па пяць, напрыклад, суніцы-клубніцы, новы гібрыд гэтых дзвюх раслін.

— З выгляду ягады ў яе пачварныя, — кажа Вікторыя. — Такой неакуратнай формы...

Звычайна клубніцы і суніцы сучасных сартоў маюць прыгожую, акуратную форму ягад, усе на кусце, ды і ў цэлым на градцы практычна аднаго памеру. Але не гэты гібрыд (ён мае назву «Купчыха»), адзначае суразмоўніца. Затое гэтыя ягады неверагодна смачныя, салодкія, духмяныя. І людзям падабаюцца: ужо не першы год «Купчыха» трымае лідарства на рынку расады. Яшчэ адзін лідар рынку — сорт «Азія» сярэдняга тэрміну паспявання, з вельмі буйнымі ягадамі. Цэннік на яго — таксама 5 рублёў.

— Вырошчваць расаду — вельмі працаёмкі працэс, — адзначае Вікторыя. — Так, раней, у савецкія часы, усе вырошчвалі яе самі. Але цяпер куды прасцей проста набыць неабходную колькасць парасткаў.

І, дарэчы, не надта вы і сэканоміце, калі вырашыце ўсё рабіць самастойна, кажуць прадаўцы. Палічыце выдаткі на насенне, грунт, фіталямпы... Не кажучы ўжо пра ваш асабісты час і месца ў кватэры. Клубніцы трэба абнаўляць кожныя тры гады, інакш расліны дрэнна пладаносяць. А значыць, без пакупнікоў Смалявіцкі гадавальнік дакладна не застанецца.

Вікторыя расказвае, што клубніц-суніц у яе сартоў 35. Ёсць вырашчаныя з італьянскага матэрыялу, ёсць — з айчыннага (у Смалявічах гэтыя ягады расцяць часцей з вусоў, чым з насення). Выбар сартоў грунтуецца на пакупніцкім попыце:

— Шмат тых, хто хоча новыя сарты, але нямала прыходзіць і людзей, якія прывыклі да старых сартоў клубніц і суніц, — заўважае суразмоўніца.



Яшчэ з «папулярнага» ў Вікторыі — зялёная цыбуля, пятрушка-кроп па 5, саджанцы ажыны па 15. Пакуль што людзі прыцэньваюцца і прыглядаюцца, кажа яна. Актыўных продажаў чакае крыху пазней, з прыходам стабільнага цяпла. На тых, хто «проста паглядзець падышоў», Вікторыя не крыўдзіцца.

— Мне падабаецца размаўляць з людзьмі. Часам бабулі прыходзяць адзінокія, ім пагаварыць няма з кім. Я з радасцю з імі пагавару — і пра кветкі, і пра клубніцы, і пра жыццё.

Каб расада добра расла, у яе трэба ўкладваць душу, лічыць суразмоўніца.

— З парасткамі трэба размаўляць. Паліваеш расаду і размаўляеш з ёй: «Маленькія мае, ну як вы тут, мае любімыя раслінкі?» Гэта вам тут кожны скажа. Таму і расце ўсё. У нас жанчына стаіць побач за прылаўкам (сёння яе няма). Прадае хатнія фіялкі. Колькі ў яе сартоў! І якое шчасце — глядзець на іх! Часам прыйдзеш на работу ў дрэнным настроі, паглядзіш на яе кветкі — і адчуеш радасць. Фіялкі — кветкі капрызныя, у мяне, напрыклад, вырошчваць іх не атрымліваецца. А ў яе растуць!

Сярод пакупнікоў Вікторыі ў асноўным дачнікі — людзі, так бы мовіць, дарослыя. Але шмат і моладзі:

— На балкон клубніцы-суніцы купляюць — сарты, што цвітуць усё лета. Ёсць і замежныя пакупнікі — у асноўным студэнты з Кітая, — працягвае Вікторыя. — Яны наогул часта ладзяць «агарод на балконе»: вырошчваюць для сябе і ягады, і агуркі-памідоры, і зеляніну.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# БУЛЬБА ЁСЦЬ І БУДЗЕ!

## У гэтым запэўніваюць у МАРГ

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю ва ўзаемадзеянні з абласцямі, Мінскім гарадскім, раённымі выканаўчымі камітэтамі праводзяць кантрольныя мерапрыемствы ў аб'ектах гандлю па пытанні выканання заканадаўства аб гандлі і абароне правоў спажыўцоў пры рэалізацыі бульбы, расказалі ў профільным міністэрстве.



Нагодай для іх правядзення сталі нараканні з боку спажыўцоў з прычыны таго, што гэтага прадукту — традыцыйнага для харчавання беларусаў — не хапае на паліцах крам, а калі ён і ёсць, то яго якасць пакідае чакаць лепшага.

Як паведамілі ў МАРГ, за мінулы тыдзень (з 18 да 24 сакавіка) такія мерапрыемствы былі праведзены ў 219 аб'ектах гандлю. Бульба адсутнічала ў чатырох гандлёвых аб'ектах: гандлёвай сетцы ТАА «Санта Рытэйл» (у Мінску), ТАА «Ікс ПЛЮС» (у Гомелі), аднаго індывідуальнага прадпрымальніка ў Гродне (не выкананы заяўкі пастаўшчыком).

У 4 % аб'ектаў да рэалізацыі прапаноўвалася бульба, якая не адпавядала патрабаванням заканадаўства (са слядамі цвілі, расколінамі і механічнымі пашкоджаннямі на клубнях, пазелянелая). Тавар, які не адпавядае патрабаванням, быў канфіскаваны з рэалізацыі.

У профільным міністэрстве дадалі, што ўсяго за перыяд з 10 да 24 сакавіка 2025 года кантрольнымі мерапрыемствамі ахоплена 989 аб'ектаў гандлю.

Устаноўлена парушэнне цэнавага заканадаўства адным індывідуальным прадпрымальнікам у частцы рэалізацыі бульбы па цане 2 рублі за кг пры вызначанай лімітавай максімальнай рознічнай цане 1,10 рубля за кіло.

— Суб'ектам гаспадарання, якія дапусцілі парушэнні заканадаўства, выдадзены рэкамендацыі аб іх ліквідацыі, — адзначылі ў МАРГ.

Таксама тут запэўнілі, што праблем з забеспячэннем другім для беларусаў хлебам няма — цяпер запасы бульбы ў стабфондах складаюць каля 17 тысяч тон, па ацэнцы, гэтых аб'ёмаў хопіць да канца міжсезоннага перыяду.

Нагадаем, што для забеспячэння ўнутранага рынку бульбай урадам уведзена ліцэнзаванне яе вывазу тэрмінам на тры месяцы. Адпаведная пастанова падпісана прэм'ер-міністрам.

— Вываз гэтай прадукцыі за межы нашай краіны будзе ажыццяўляцца па ліцэнзіях, якія выдаюцца МАРГ па ўзгадненні з Мінсельгасхарчам, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам. Ліцэнзаванне дазволіць забяспечыць кантроль над запасамі, а таксама над экспартнымі патокамі бульбы ў сувязі з ростам попыту і высокай цаной на яе за межамі Рэспублікі Беларусь, — рэзюмавалі ў міністэрстве.

УСТУПНАЯ-2025

# «МОЙ ВЫБАР — СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА. І ЁН УСВЯДОМЛЕНЫ»

## Чым прыцягне абітурыентаў БДАТУ

Пачнём з таго, што Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт — не проста ўніверсітэт, а адукацыйны, навуковы і інавацыйны цэнтр Рэспублікі Беларусь. З адпаведнымі магчымасцямі і кампетэнцыямі.

— Наш універсітэт насамрэч мае шэраг унікальных асаблівасцяў і з'яўляецца вядучай аграрнай тэхнічнай установай вышэйшай адукацыі. Мы максімальна нацэлены на практыкаарыентаваную падрыхтоўку спецыялістаў. Паралельна з асноўнай вучобай у студэнтаў ёсць магчымасць атрымаць рабочую прафесію (кіроўца механічных транспартных сродкаў катэгорыі «В»; трактарыст-машыніст катэгорыі «С», «D», «F»; слесар па рамонце сельскагаспадарчых машын і абсталявання; электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання). І гэта не ўсё — пры жаданні маладыя людзі могуць атрымаць і іншыя спецыяльнасці: спартыўнага трэнера, спецыяліста па кадравым справаводстве, арганізатара экскурсійнага абслугоўвання насельніцтва, гаспадара аграсядзібы, кансультанта па абароне правоў спажыўцоў, — расказвае **рэктар універсітэта Мікалай РАМАНЮК**.



Навучанне тут арганізавана на пяці асноўных факультэтах: аграмеханічным, аграэнергетычным, факультэце «Тэхнічны сэрвіс у АПК», факультэце прадпрымальніцтва і кіравання і факультэце давузаўскай падрыхтоўкі і прафесійнай арыентацыі моладзі. Пяць з шасці інжынерных спецыяльнасцяў адносяцца да катэгорыі найбольш запатрабаваных эканомікай, што дазваляе паступаць без экзаменаў уладальнікам залатога ці сярэбранага медалёў, дыплома з адзнакай пасля заканчэння ліцэя або каледжа, пераможцам апошніх этапаў рэспубліканскіх алімпіяд. А абітурыентам, якія прайшлі тэрміновую ваенную службу, даецца права пазаконкурснага залічэння.

## ЛЕПШ РАЗ УБАЧЫЦЬ...

— Ва ўніверсітэце створана ўнікальная матэрыяльная база, і ў нас дзейнічае правіла — лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць, — адзначае Мікалай Раманюк. — Студэнты не па плакатах, а, як кажуць, на зуб могуць паспрабаваць, з якіх дэталяў складаецца трактар, як працуе рухавік, у чым асаблівасць даільнага абсталявання і для чаго патрэбны GPS-тэхналогіі ў энерганасычанай мабільнай тэхніцы, — пра ўсё гэта можна даведацца не выходзячы за межы студэнцкага гарадка.

## НЕ НАВУЧАННЕМ АДЗІНЫМ

Тэрыторыя ўніверсітэта ўяўляе сабой паўнавартасны студэнцкі кампус, дзе ёсць усё неабходнае і нават больш не толькі для паспяховага навучання, але і для самаразвіцця, пошуку і раскрыцця талентаў.

— Усе навуковыя карпусы і інтэрнаты размешчаны ў крокавай даступнасці адзін ад аднаго ў самым цэнтры Мінска, — расказвае рэктар. — Сталовая, маладзёжны цэнтр, спартыўныя пляцоўкі — у адным месцы. Для нашай моладзі створаны і працуюць больш за 50 клубных фарміраванняў, 16 спартыўных секцый, а гурт «Велес» вядомая не толькі ў студэнцкім асяроддзі, у Беларусі, але і за яе межамі. У нас ёсць выдатны тэатр. На слыху ў краіне і ўніверсітэцкі валанцёрскі цэнтр «Сава».



***Падзяліцца ўражаннямі аб альма-матар, аб вучобе і жыцці там, расказаць аб мэтах і планах на будучыню мы папрасілі студэнтаў БДАТУ.***

**Мікіта, студэнт першага курса факультэта «Тэхнічны сэрвіс у аграпрамысловым комплексе»:**

— Я — будучы спецыяліст па ахове працы, буду адказваць за бяспеку людзей на вытворчасці, не дапускаць іх траўміравання. Праца, можа, не такая адказная, як у медыкаў або міліцыянераў. Але яна таксама накіравана на выратаванне чалавечых жыццяў.

Мікіта родам са Жлобіна. Паступаў па мэтавым накіраванні. Важны этап станаўлення ён ужо прайшоў — скончыў каледж і адслужыў у арміі. Месцам сваёй будучай работы хлопец выбраў адно з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў на Брэстчыне.

— Я пабываў у гаспадарцы, мне там вельмі спадабалася, са мной пагутарыў кіраўнік. Цяпер чакаю не дачакаюся, калі паеду туды працаваць. Хачу звязаць сваё жыццё не толькі з гэтым прадпрыемствам, але і з сельскай гаспадаркай у цэлым. І гэта мой свядомы выбар.

**Раман, студэнт першага курса факультэта «Тэхнічны сэрвіс у аграпрамысловым комплексе».**



— Як я трапіў сюды? З дзяцінства марыў дапамагаць людзям і як мог чымсьці дапамагаў. А калі вырас, пачаў думаць: чаму б дапамогу людзям не зрабіць справай свайго жыцця? Доўга шукаў, якую прафесію знайсці, пакуль да нас у «Энергетык», што ў Дзяржынскім раёне, не прыехалі прадстаўнікі БДАТУ і не расказалі пра яго. Дарэчы, я раней і не ведаў пра існаванне такой ВНУ. Даведаўся і загарэўся: буду паступаць менавіта туды. Калі выбіраў спецыяльнасць, «зачапіўся» за інжынера па ахове працы. І вырашыў: гэта якраз тая прафесія, праз якую я змагу ўвасобіць сваю мару ў жыццё — дапамагаць людзям.

Ва ўніверсітэце Раман знайшоў яшчэ адно сваё прызванне — ён стварае патрыятычныя фільмы, у асноўным пра Вялікую Айчынную вайну. Мае намер працягнуць гэта захапленне.





**Аляксандр, студэнт 4 курса аграэнергетычнага факультэта:**

— Мая спецыяльнасць звязаная з электрыкай, і гэта маё прызванне. Многія пытаюцца: «Чаму менавіта аграрная ВНУ, а не тэхнічная? Ты ж працаваць будзеш у сельскай гаспадарцы». Я сам родам з вёскі і сваю прафесійную дзейнасць хачу звязаць менавіта з сельскай гаспадаркай. Новыя тэхналогіі прыходзяць і туды. Таму бясцэнныя навыкі, якія мы атрымліваем ва ўніверсітэце сёння, будуць актуальныя ў любым месцы.

Мой суразмоўца жыве ў інтэрнаце і вельмі задаволены ўмовамі. Паводле яго слоў, тут утульна і камфортна, абстаноўка прыязная. Аляксандр вядзе актыўнае студэнцкае жыццё, ён удзельнік вядомага гурта «Велес».

— Канцэрты, выступленні не перашкаджаюць вучобе. Наадварот, дапамагаюць ператварыцца з фізіка ў лірыка. А потым са свету музыкі зноў заглыбіцца ў любімы свет электрыкі.

**Алена ВІНАГРАДАВА,**
**фота аўтара.**

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!
Камуністычная партыя (большавікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ

58 (7384)
ПЯТНІЦА
30
сакавіка 1945 г.
Цана 20 кап.

Арганізуем усесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай 1945 года

Узорна праведзем веснавую сяўбу!

Зварот

КАЛГАСНІКАЎ І КАЛГАСНІЦ СЕЛЬГАСАРЦЕЛІ ІМЕНІ ЧЫРВОНЫХ ПАРТЫЗАН, БРУХАВЕЦКАГА РАЁНА, КРАСНАДАРСКАГА КРАЯ, ДА ЎСІХ КАЛГАСНІКАЎ І КАЛГАСНІЦ, ТРАКТАРЫСТАЎ І ТРАКТАРЫСТАК, АГРАНОМАЎ, МЕХАНІКАЎ І ІНЖЫНЕРАЎ, ДА ЎСІХ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ САВЕЦКАГА САЮЗА

## • На фронце

На працягу 28 сакавіка на паўднёвым захадзе ад Кёнігсберга войскі 3-га Беларускага фронту прадаўжалі баі па знішчэнні рэштак разгромленых часцей праціўніка ў раёне мыса Кальхольцэр-Хакен.

Паводле звестак Савецкага інфармбюро, войскі 2-га Беларускага фронту ў гэты дзень штурмам авалодалі горадам Гдыня — важнай ваенна-марской базай і буйным портам на Балтыйскім моры. У баях за Гдыню войскі фронту ўзялі ў палон да 9 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў, а таксама захапілі шмат узбраення і розный ваенай маёмасці.

Адначасова войскі фронту пасля ўпартых баёў занялі заходнюю частку горада Гданьска (Данцыга) і ачышчалі ад праціўніка гарадскі раён, размешчаны на востраве Холм. Войскі 2-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне па паўднёвым беразе Дуная, 28 сакавіка авалодалі гарадамі Дзьер і Комарам — важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на Венскім напрамку, а таксама з баямі занялі больш за 40 іншых населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты Геньо, Дзьерсенцівань, Кішмедзьер, Менфе, Ніўлфалу.

Войскі 3-га Украінскага фронту, развіваючы наступленне, фарсіравалі раку Раба і ў гэты дзень авалодалі гарадамі Чорна і Шарвар — важнымі вузламі чыгунак і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў, якія прыкрывалі шлях да граніц Аўстрыі, а таксама занялі больш чым 150 іншых населеных пунктаў, сярод якіх Бегетэ, Калд, Олша, Папоц, Сіглігет і чыгуначныя станцыі Герчэ, Калд, Ук, Гоганфа, Шумег.

На другіх участках фронту — пошукі разведчыкаў і ў шэрагу пунктаў — баі мясцовага значэння.

## • У тыле

Сям'я Шапавалавых з вёскі Трыніўкі, што на Суражчыне, да вайны жыла звычайным шчаслівым жыццём. Арцём з жонкай — бацькі пяцярых дзяцей — працавалі ў калгасе, карысталіся вялікай павагай аднавяскоўцаў, жылі ў прасторнай хаце і вельмі любілі сваіх сыноў і дачку.

«Мы сапраўды шчаслівыя, — часам гаварыў Арцём сваёй жонцы. — Добрыя дзеці — вялікае шчасце! А галоўнае — нашы дзеці вучацца...»

Таню ён марыў вывучыць на настаўніцу, Ваню і Лёню — на камандзіраў Чырвонай Арміі, чатырохгадовага Колю — на інжынера. А самага маленькага сына Пецю бачыў трактарыстам.

Калі пачалася вайна, гітлераўская зграя дайшла і да той вёскі, дзе жыла гэта шчаслівая сям'я. У першых шэрагах патрыётаў стаяў Арцём




Шапавалаў. Ён — начальнік штаба партызанскага атрада — абараняў ад людаедаў-немцаў сваю сям'ю і Радзіму. Аднойчы ў жорсткай, няроўнай схватцы Арцём загінуў смерцю храбрых. Паміраючы, ён прасіў толькі аб адным: «Паглядзіце за маімі дзеткамі!»

Палалі калгасныя хаты, лілася кроў нявінных жанчын і дзяцей... Арцёміха з дзецьмі цудам выратавалася. Яна была маці, маці пяцярых дзяцей, якая стала воінам-партызанам, помсціла за мужа, за бязлітасна разбураны сямейны ачаг. Калі Марына трапіла ў лапы немцаў, яна цвёрда сказала, што гаварыць ім нічога не будзе. За гэта гітлераўцы катавалі яе і ўрэшце расстралялі.

«Так дзеці Шапавалавых сталі сіротамі. Бацькоўскімі клопатамі акружылі іх партызаны: прыносілі хлеб, бульбу, малако», — пісала наша газета. Самая дарослая Таня стала гаспадыняй: гатавала ежу, шыла, мыла, латала бялізну, забаўляла малых.

Гэта яна і распавяла «Звяздзе» трагічную гісторыю іх сям'і, а таксама аб далейшым лёсе дзяцей — Шапавалавых. Пасля вызвалення дзяўчынцы знайшлі прытулак у Віцебскім дзіцячым доме. Там яна вучылася ў школе, а таксама асвойвала кравецкую справу. «Трынаццацігадовы Ваня і дванаццацігадовы Лёня таксама выхоўваліся ў Лёзненскім дзіцячым доме, сямігадовы Коля — у Багушэўскім дзетдоме», — пісала наша газета.

Вось, што пісаў Ваня ў сваім лісце: «Дарагая сястрычка! Як я ўжо раней пісаў табе, жыву я з Лёнем добра. Кормяць нас смачна. Выхавацельніцы шкадуюць нас. Я вучуся ў трэцім класе, а Лёня — у другім. Мы маем адзнакі 5 і 4. У нас ёсць майстэрня. Мы робім там розныя рэчы. Мы з таварышам змайстравалі лямну. Гэта праца мне вельмі падабаецца. Як падрасту, я, напэўна, буду тэхнікам. А Лёнька, як і раней, думае стаць камандзірам Чырвонай Арміі. Няхай сабе будзе камандзірам. Напішы, дарагая сястрычка, што чутна аб нашых малышах Пеці і Каці. Пішы мне. З прывітаннем твой родны брат Ваня».

Пеця жыў, паводле звестак, у Сіроцінскім раёне ў цёткі Лізаветы. Каця, зусім яшчэ маленькая, гадавалася ў Смалоўскім дзетдоме Віцебскай вобласці, «на тры кілаграмы прыбавілася ў вазе. У яе выраслі пярэднія зубкі. Яна навучылася хадзіць і называе мяне «мама»», — пісала Ганна Іванаўна, выхавальніца дзетдома.

Балюча чытаць гісторыю дзяцінства Тані, Вані, Лёні, Колі, Пеці і Каці Шапавалавых. А яшчэ ўсведамляць, колькі дзяцей, акрамя іх, засталіся без бацькоўскага клопату і падтрымкі з-за нямецкіх бандытаў. Але іх не пакінулі добрыя людзі і Радзіма.

Дарэчы, можа, вы ведаеце кагосьці з гэтай сям'і, пра якую пісала «Звязда» ў далёкім 1945-м? Напішыце нам. Цікава, як склаўся іх лёс...

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**



## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Автотрансстрой»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1906 | Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-49332 (назначение – здание специализированное транспорта, наименование – главный корпус, общая площадь (протяженность) – 5 126,1 кв. м; составные части и принадлежности: 2А1/кп-главный корпус, а-забор, в-площадка с асфальтобетонным покрытием, г-емкость для масел, ж-участок теплотрассы) | 2159361,79 | 215936,18 | 107968,09 |
| | Клумба, инв. № 16587; озелененная территория, инв. № 999 | | | |
| | Имущество согласно списку № 1: https://orgtorg.by/upload/doc/avtotransstroj/glavnyj-korpus/list-1.pdf | | | |
| В отношении лота проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 40 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 50 (30438) от 13.03.2025, стр. 14 | | | | |
| **Местонахождение:** Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2/2 | | | | |
| В отношении кап. строения с инв. № 630/С-49332 имеется обременение (ограничение) в виде аренды. По вопросам обременений обращаться по тел. +375295767715, Юлия | | | | |
| Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 642000000003000030, площадь 4,4298 га, целевое назначение – для обслуживания и эксплуатации производственной базы. Право постоянного пользования. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, код – 5,1, площадь – 0,7390 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,7390 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, код – 5,5, площадь – 0,7390 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах объектов газораспределительной системы, код – 5,7, площадь – 0,7390 га | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **8 апреля 2025 в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 28 марта 2025 года до 16.00 7 апреля 2025 года** | | | |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Автотрансстрой», проводимых 08.04.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
